# Жыццёвы лёс Дзмітрыя Прышчэпава (1924–1940)

УДК 94(476)(092)



**Аляксандр БАРАНОЎСКІ,**
**кандыдат**
**гістарычных навук**

Аляксандр БАРАНОЎСКІ. Жыццёвы лёс Дзмітрыя Прышчэпава (1924–1940). У артыкуле ідзе гаворка пра малавядомыя старонкі з жыцця Д. Прышчэпава, які прымаў актыўны ўдзел у дзяржаўным будаўніцтве савецкай Беларусі і яе сацыяльна-эканамічным развіцці. Намаганні наркама земляробства БССР паспрыялі развіццю айчыннай сельскагаспадарчай і лясной навукі, адбылася іх інстытуцыялізацыя. Д. Прышчэпаў быў ініцыятарам стварэння спецыялізаваных часопісаў, прысвечаных пытанням сельскай і лясной гаспаркі. Аўтарам была прааналізавана і ўведзена ў навуковы ўжытак значная колькасць архіўных дакументаў.

Ключавыя словы: Наркамат земляробства БССР, сельскагаспадарчая секцыя Інбелкульта, камісія Затонскага, справа «Саюза вызвалення Беларусі».

Aliaksandr BARANOUSKI. Life journey of People's Commissar for Agriculture of the BSSR Dmitry Prishchepov (1924–1940). The article recounts little-known episodes of the life of Dmitry Prishchepov who took an active part in state building and socio-economic development of Soviet Belarus. The efforts of People's Commissar for Agriculture contributed to the development of domestic agricultural and forestry science that was later institutionalized. Dmitry Prishchepov initiated the publication of agriculture and forestry journals. The author has analyzed and introduced into scientific circulation a great number of archival documents.

Keywords: People's Commissariat for Agriculture of the BSSR, agricultural section of the Institute of Belarusian Culture, Zatonsky's commission, the case of the "Belarus Liberation Union".

21 лістапада 2021 года споўнілася 125 год з дня нараджэння Дзмітрыя Прышчэпава. Імя гэтага чалавека сёння амаль невядома шырокай аўдыторыі, хоць у свой час ён зрабіў бліскучую кар'еру: у 23 гады ўзначаліў партыйныя і савецкія органы Сенненскага павета, у 27 стаў старшынёй Віцебскага губвыканкама, а ў 28 гадоў кіраваў Наркаматам земляробства БССР. Як складваўся лёс Д. Прышчэпава да 1924 года, да яго прызначэння на пасаду наркама земляробства, мы пісалі ў артыкуле «Дзмітрый Прышчэпаў: невядомыя старонкі біяграфіі» («Беларуская думка» № 6, 2020). А цяпер гаворка пойдзе пра яго дзейнасць, пачынаючы з 1924 года і да самай смерці ў 1940 годзе.

Пасля канчатковай ліквідацыі Віцебскага губвыканкама яго былы старшыня Д. Прышчэпаў працягнуў сваю працу ў Наркамаце земляробства БССР. Белбюро ЦК РКП(б) 24 сакавіка 1924 года зацвердзіла яго першым намеснікам наркама *[1]*. Гэта рашэнне было пацверджана пастановай СНК БССР ад 16 красавіка 1924 года *[2]*.

У лістападзе 1924 года стала вакантнай пасада наркама земляробства БССР. Лепшай за кандыдатуру Д. Прышчэпава ў той час не было, і таму ўрад БССР 27 лістапада 1924 года прапанаваў ЦВК БССР прызначыць яго наркамам

**ПРА АЎТАРА**

БАРАНОЎСКІ Аляксандр Віктаравіч.

Нарадзіўся ў 1992 годзе ў г. Сянно Віцебскай вобласці.

Скончыў гістарычны факультэт Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава (2016), магістратуру пры ім (2017), аспірантуру пры Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (2020).

З 2020 года – навуковы супрацоўнік аддзела навейшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

Кандыдат гістарычных навук (2021).

Аўтар больш як 80 навуковых публікацый.

Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя беларускай дзяржаўнасці, фарміраванне дзяржаўнай тэрыторыі Беларусі, беларуска-расійскія адносіны, краязнаўства Сенненшчыны.

земляробства БССР *[3]*. 9 мая 1925 года гэта прапанова была падтрымана Першай сесіяй ЦВК БССР *[4]*. Больш за пяць гадоў Дзмітрый Прышчэпаў узначальваў Наркамат земляробства. У савецкай гістарыяграфіі ён клеймаваўся як «чырвоны Сталыпін». Насамрэч наркам земляробства БССР перавагу аддаваў не хутарской, а пасялковай форме землекарыстання. З дзейнасцю Д. Прышчэпава як наркама земляробства БССР, а таксама поўнай карцінай развіцця сельскагаспадарчай галіны ў 1924–1929 гадах можна пазнаёміцца ў дысертацыйных даследаваннях і манаграфіях доктара эканамічных навук Віталя Бусько і доктара гістарычных навук Сяргея Ходзіна. Мы ж у гэтым артыкуле засяродзім увагу толькі на малавядомых старонках таго перыяду жыцця наркама.

Працуючы на пасадзе наркама земляробства БССР, Д. Прышчэпаў быў адначасова і членам камісіі па землеўпарадкаванню працоўных яўрэяў пры прэзідыуме Савета нацыянальнасцей, а таксама ўзначальваў Беларускі камітэт па зямельным уладкаванні працоўных яўрэяў *[5]*.

З 1925 па 1927 год Дзмітрый Прышчэпаў з'яўляўся старшынёй сельскагаспадарчай секцыі Інстытута беларускай культуры, якая аб'ядноўвала супрацоўнікаў даследчых устаноў, працаўнікоў вопытных устаноў і станцый, спецыялістаў Наркамата земляробства БССР, грамадскіх аграномаў і інш. Сельскагаспадарчая секцыя на чале з Д. Прышчэпавым займалася вырашэннем наступных пытанняў: «1) апрацоўка навуковай беларускай с.-г. тэрміналогіі, 2) апрацоўка с.-г. літаратуры на беларускай мове і адпаведна ўмовам Беларусі, 3) вывучэнне гісторыі разьвіцця сельскай гаспадаркі і с.-г. прамысловасьці на Беларусі, 4) вывучэнне с.-г. быту вёскі, 5) вывучэнне зямельнага права і зямельных адносін на Беларусі да рэвалюцыі і пасля рэвалюцыі ў сувязі з зямельнай палітыкай, 6) вывучэнне эканомікі беларускай сельскай гаспадаркі, 7) вывучэнне пытанняў каапэравання сельскай гаспадаркі і сельскагаспадарчай прамысловасці на Беларусі, 8) вывучэнне с.-г. даследчай справы на Беларусі, 9) распрацоўка найбольш пільных пытанняў тэхнікі беларускай сельскай гаспадаркі па літаратурных крыніцах, на падставе сабраных даследчымі ўстановамі матэр'ялаў і ўласных даследаванняў самой сэкцыі, 10) агрaпрапаганда» *[6]*. Сельскагаспадарчай секцыяй і яе падсекцыямі былі падрыхтаваны і праведзены шэраг самастойных даследаванняў. Апрача гэтага, секцыя разгарнула працу па дробнаму сельскагаспадарчаму раянаванню БССР, у выніку якой былі створаны карты геаграфіі асобных сельскагаспадарчых культур і паказчыкаў інтэнсіўнасці сельскай гаспадаркі ў асобных рэгіёнах БССР.

Па ініцыятыве сельскагаспадарчай секцыі Інбелкульта ў 1927 годзе быў заснаваны Беларускі навукова-даследчы інстытут сельскай і лясной гаспадаркі імя У.І. Леніна (БелНДІСіЛГ), куды і перайшла ўся даследчая работа, распачатая гэтай секцыяй *[7]*. Паступова БелНДІСіЛГ стаў самастойнай вышэйшай навукова-даследчай установай пры СНК БССР. 1 кастрычніка 1927 года сельскагаспадарчая секцыя была рэарганізавана і Д. Прышчэпаў перастаў яе ўзначальваць, сканцэнтраваўшы сваю навуковую дзейнасць у БелНДІСіЛГ (1927–1930). Гэты інстытут праводзіў даследаванні ў галіне сельскагаспадарчай эканомікі і аграрнай палітыкі, меліярацыі і культуры балот,



**Члены сельскагаспадарчай секцыі Інстытута беларускай культуры, 1920-я гады: ніжні рад – С.В. Скандракоў, Д.Ф. Прышчэпаў, А.А. Смоліч, Я. Грабоўскі; верхні рад – І.М. Серада, Э.С. Русецкі, Ч.І. Родзевіч, А. Трахімаў, І.А. Кіслякоў**
Крыніца: часопіс «Сельская і лясная гаспадарка». № 1, 1929 год



**Д.Ф. Прышчэпаў разам з жонкай падчас дзесяцідзённага спаткання. Беламорска-Балтыйскі лагер НКУС (ст. Мядзвежая Гара), Аўтаномная Карэльская ССР. 1932 год**
Крыніца: фонды Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.

жывёлагадоўлі і раслінаводства, лесаводства і землеўпарадкавання. Першачарговую ўвагу тут надавалі даследаванням тых галін гаспадаркі, што раней знаходзіліся па-за ўвагай даследчыкаў і мелі вялікае значэнне для аднаўлення і развіцця сельскай і лясной гаспадаркі БССР. БелНДІСіЛГ не толькі займаўся навукова-даследчай дзейнасцю, ён яшчэ рыхтаваў навуковыя кадры для сельскай і лясной гаспадаркі *[8]*.

Па ініцыятыве праўлення і асабіста старшыні Савета БелНДІСіЛГ Д. Прышчэпава стаў выходзіць часопіс «Сельская і лясная гаспадарка». Выданне было разлічана на шырокае кола чытачоў, а яго галоўнай мэтай з’яўлялася асвятленне пытанняў сельскай і лясной гаспадаркі БССР. У ім публікавалі афіцыйныя дакументы, бібліяграфію, матэрыялы аб замежным сельскагаспадарчым вопыце. На старонках часопіса «Сельская і лясная гаспадарка» неаднаразова друкавалі беларускамоўныя артыкулы наркама земляробства БССР. Іх тэматычная накіраванасць была разнастайнай – ад артыкулаў, прысвечаных самому БелНДІСіЛГ, да ўражанняў ад паездкі наркама ва Усходнюю Прусію і Данію.

Важнае месца ў папулярызацыі сельскагаспадарчых ведаў займаў часопіс «Плуг». Ён выдаваўся штомесяц на працягу 1925–1929 гадоў пры непасрэдным удзеле Д. Прышчэпава. Дарэчы, яго артыкул адкрываў першы нумар часопіса. Д. Прышчэпаў з’яўляўся яшчэ членам рэдакцыйнай калегіі штомесячнага грамадска-эканамічнага часопіса «Советское строительство», што выдаваўся Дзяржпланам БССР. На яго старонках таксама публікаваліся артыкулы наркама земляробства БССР.

Такім чынам, дзякуючы намаганням Дзмітрыя Прышчэпава быў закладзены падмурак айчыннай сельскагаспадарчай і лясной навукі, адбылася іх інстытуцыяналізацыя. Таксама па ініцыятыве наркама земляробства БССР было наладжана выданне спецыялізаваных часопісаў, што расказвалі аб навуковых дасягненнях у галіне сельскай і лясной гаспадаркі і былі разлічаны на шырокае кола чытычоў.

У чэрвені 1928 года Цэнтральная кантрольная камісія КП(б)Б пачала расследаванне супраць наркама земляробства БССР. Д Прышчэпаў быў абвінавачаны ў тым, што браў на службу «асоб чуждых савецкай уладзе». У выніку разбіральніцтва ўстанавілі, што нарkам без узгаднення з АДПУ БССР і нягледзячы на папярэджанні з боку апошняга, прымаў на службу асоб, якія раней былі звольнены з працы ў парадку чысткі АДПУ. 27 чэрвеня 1928 года справу Прышчэпава разглядала парткалегія ЦКК КП(б)Б. Азнаёміўшыся з усімі матэрыяламі, калегія пастанавіла: «Паставіць на від т. Прышчэпаву за недапушчальнасць прыёму на службу ў НКЗем асоб чуждых савецкай уладзе» *[9]*.

У студзені 1929 года была распачата справа аб парушэнні класавай лініі ў дзейнасці Асобай калегіі Вышэйшага кантролю (АКВК) пры Наркамаце земляробства БССР. 17 студзеня 1929 года на аб’яднаным пасяджэнні прэзідыума ЦКК КП(б)Б і калегіі Наркамата рабоча-сялянскай інспекцыі была прынята пастанова па справе старшыні АКВК Я. Лабаноўскага. Яго абвінавацілі ў сістэматычным скрыўленні дырэктыў партыі і парушэнні класавай лініі ў галіне зямельнай палітыкі. Д. Прышчэпаву ў гэтай пастанове ўказалі на амаль што «поўную адсутнасць з боку НКЗема нагляду і палітычнага кіравання дзейнасці АКВК», наяўнасць «выпадкаў падтрымання няправільнай лініі АКВК» *[10]*. Наркаму земляробства БССР настойліва прапаноўвалі «правесці тэрмінова чыстку апарату, узмацніўшы яго партыйна-рабочаю часткаю» *[10]*.

Гэтыя абставіны, а таксама незадаволенасць асобай наркама з боку кіраўніцтва рэспублікі прывялі да таго, што на падставе пастановы СНК БССР ад 23 сакавіка 1929 года Д. Прышчэпаў быў вызвалены ад абавязкаў наркама земляробства БССР *[11]*. Прэзідыум ЦВК БССР 6 красавіка 1929 года на сваім пасяджэнні пацвердзіў рашэнне СНК БССР *[12]*. У той жа дзень прэзідыум Дзяржплана быў праінфармаваны аб прызначэнні Д. Прышчэпава першым намеснікам старшыні *[13]*.

Матэрыялаў аб дзейнасці Дзмітрыя Прышчэпава на новай пасадзе не захавалася, ці пакуль яны не выяўлены. Затое захаваліся шматлікія матэрыялы аб тым перыядзе яго жыцця. 8 мая 1929 года сакратарыят ЦК КП(б)Б даў Д. Прышчэпаву станоўчую характарыстыку для паступлення ў Інстытут чырвонай прафесуры. Ён паспяхова здаў уступныя экзамены, але вучыцца ў інстытуце Д. Прышчэпаву не было наканавана: з лета 1929 года над ім пачалі згушчацца хмары *[14]*.



**Д.Ф. Прышчэпаў. 1920-я гады**
Крыніца: фонды Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.

З мая па чэрвень 1929 года ў Мінску працавала камісія ЦКК УКП(б) на чале са старшынёй ЦКК КП(б)У У.П. Затонскім. Камісія на працягу 52 дзён вывучала практыку правядзення нацыянальнай работы ў БССР. Яе даклад «Аб абследаванні практыкі нацработы ў БССР» быў прадстаўлены на пасяджэнні бюро ЦК КП(б)Б 27 чэрвеня 1929 года.

Дакладчык У. Затонскі, сканцэнтраваў увагу прысутных на актывізацыі ў рэспубліцы нацыянальна-дэмакратычнай ідэалогіі. Ім былі агучаны яе праявы ў навуковым жыцці рэспублікі, літаратурнай творчасці і тэатры *[15]*. Асобна дакладчык спыніўся на ідэолага-тэарэтычных і палітычных аспектах памылак у зямельнай палітыцы БССР. У. Затонскі адзначаў, што з санкцыі ЦК КП(б)Б праводзілася «линия на создание крепкого хуторского хозяйства» *[16]*. Выразнікам гэтай лініі быў названы Д. Прышчэпаў, да нядаўняга часу наркам земляробства. Яго дырэктывы актыўна цытаваліся ў дакладзе. У. Затонскі падкрэсліваў, што «несмотря на явную орентацию на буржуазный Запад, белорусский национализм носит характерные черты чисто кулацкой подоплеки» *[16]*.

Пасля даклада Затонскага над Дзмітрыем Прышчэпавым навіс дамоклаў меч. Яго далейшы партыйны лёс вырашаўся 11 верасня 1929 года на парткалегіі ЦКК КП(б)Б. Падчас свайго выступу былы наркам земляробства БССР прызнаў, што, кіруючы працай наркамата, дапусціў шэраг палітычных памылак у зямельным пытанні: «Первая: относительно норм землепользования – эти нормы землепользования были в 1924 г. подписаны т. Гельтманом, я тогда был еще заместителем. Я поднимал вопрос против этих норм в 1927 г. и в прошлом году, но это не встретило энергичной поддержки. Разработка этого вопроса была поручена особой комиссии и до сих пор еще это не разработано. В вопросе норм землепользования у меня нет достаточного классового нюха и в этом отношении обвинение является правильным. Вторая: относительно форм землепользования. Ясно, что мелкие поселки не являются базой коллективизации деревни, тот циркуляр (секретный) подписанный мною является принципиально недопустимым. Нужно было брать курс на землеустройство деревень на месте. Третий момент: что мы брали курс на кооперирования вообще, а не на коллективизацию. Мы достигли 50 % кооперирования, но отстаем от других республик в коллективизации. Эти три основных момента я считаю правильными, и я признаю за собой эту вину» *[17]*.

Нягледзячы на прызнанне шэрагу памылак з боку Д. Прышчэпава, парткалегія палічыла даказаным, што на працягу некалькіх год ім праводзілася палітыка насаджэння хутароў, падтрымкі кулацкіх і былых памешчыцкіх гаспадарак. Было прынята рашэнне аб выключэнні яго з радоў КП(б)Б. Аднак маючы на ўвазе дадатковыя матэрыялы ў адносінах да палітычнага мінулага Д. Прышчэпава, была прынята пастанова разглядзець партыйную справу былога наркама на пасяджэнні прэзідыума ЦКК КП(б)Б. У гэтай пастанове таксама падкрэслівалася, што Дзмітрый Прышчэпаў і пасля «высвятлення ўсіх момантаў праваапартуністычнай палітыкі НКЗ, у прыватнасці, камісіяй ЦКК УКП(б) (т. Затонскага), працягваў настойваць на правільнасці праводзімай ім лініі, спасылаючыся нібыта на дырэктывы ЦК КП(б)Б і пастановы III з'езда Саветаў СССР» *[18]*.

У той жа дзень бюро ЦК КП(б)Б вызваліла Д. Прышчэпава ад абавязкаў намесніка старшыні Дзяржаўнай планавай камісіі БССР, а таксама члена Эканамічнай нарады пры СНК БССР *[19]*. Гэта рашэнне было пацверджана на пасяджэнні СНК БССР 14 верасня 1929 года *[20]*. 19 верасня 1929 года на сумесным пасяджэнні прэзідыума і парткалегіі ЦКК КП(б)Б прынялі пастанову аб выключэнні Д. Прышчэпава з радоў КП(б)Б *[21]*. Гэта пастанова была зацверджана 20 верасня 1929 года на пасяджэнні бюро ЦК КП(б)Б *[19]*.

У кастрычніку 1929 года Дзмітрый Прышчэпаў быў адпраўлены на працу ў Мазырскую акругу. Яго пераемнік на пасадзе наркама земляробства БССР П. Рачыцкі сваім загадам прызначыў Д. Прышчэпава загадчыкам Палескай

раённай пясчанай станцыі, што знаходзілася ў сяле Скрыгалаў *[22]*. Станцыя пачала працаваць з восенні 1925 года і ў асноўным займалася вывучэннем кармавога пытання, а таксама неабходнасцю павелічэння ўраджаяў на беднай пясчанай глебе з блізкімі грунтовымі водамі.

Дзе б ні працаваў Д. Прышчэпаў, якія б пасады ні займаў, ён заўсёды рабіў больш, чым ад яго патрабавалася. Гэты тэзіс пацвярджаўся яго працай і ў якасці загадчыка станцыі. Дзякуючы намаганням Д. Прышчэпава ў Скрыгалаве з'явілася электрычнасць. Былы наркам дабіўся ад СНК БССР выдзялення паравога лакамабіля, турбін і іншага абсталявання, неабходнага для выпрацоўкі электрычнасці *[23]*.

Працуючы загадчыкам станцыі, Дзмітрый Прышчэпаў не губляў надзеі на рэабілітацыю. У снежні 1929 года ён звяртаўся ў ЦК УКП(б) і ЦКК з просьбай аб аднаўленні ў членах партыі. Яго справа нават пасылалася ў Маскву, але жаданага выніку не было *[24]*.

З сярэдзіны 1930 года ў рэспубліцы пачалі распаўсюджвацца чуткі, што ў БССР, як і ў УССР, органамі ДПУ выяўлена падпольная контррэвалюцыйная арганізацыя – «Саюз вызвалення Беларусі», якая нібыта мела на мэце звяржэнне савецкай улады, выхад рэспублікі са складу СССР і ўсталяванне ў БССР буржуазных парадкаў. Арышты па падазрэнні ў прыналежнасці да міфічнай арганізацыі пачаліся ў чэрвені і працягнуліся да восені 1930 года *[15]*. 19 ліпеня 1930 года ў Скрыгалаве быў арыштаваны і Дзмітрый Прышчэпаў.

Абвінаваўчае заключэнне на Д. Прышчэпава і іншых удзельнікаў міфічнай арганізацыі «Саюз вызвалення Беларусі» ўжо ў кастрычніку 1930 года паступіла ў судовую калегію АДПУ для вынясення абвінаваўчых пазасудовых прысудаў. Разам з ім у прыналежнасці да арганізацыі, якую нібыта ўзначальвалі В. Ластоўскі, Я. Лёсік, С. Некрашэвіч, А. Смоліч і іншыя «нацыянал-дэмакраты», абвінавачваліся былы наркам асветы БССР А. Баліцкі, былы намеснік наркама земляробства БССР А. Адамовіч і былы намеснік старшыні «Белпайгандлю» П. Ільючонак *[24]*.

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захоўваецца справа «Паказанні Прышчэпава», якая ўтрымлівае ўжо машынапісныя паказанні былога наркама земляробства БССР ад 3, 20, 22, 27, 28 верасня 1930 года *[14]*. Пра свой удзел у «Саюзе вызвалення Беларусі» Д. Прышчэпаў заяўляў наступнае: «О существовании какой-нибудь белорусской национал-демократической организации абсолютно ничего не знаю и никогда не знал» *[14]*.

Мы можам толькі здагадвацца, што ў тыя часы адбывалася ў ізалятарах з людзьмі, якія праходзілі па справе «Саюз вызвалення Беларусі», і чаму многія пачыналі агаворваць сябе і іншых таварышаў. Азнаёміўшыся з успамінамі дачкі Дзмітрыя Прышчэпава адносна яго знаходжання ў папярэднім зняволенні, становіцца крыху зразумела. Ала Дзмітрыеўна даведалася пра гэта ад маці – Любові Апалінар'еўны: «Отца держали в одиночке ГПУ, издевались над


5

З А Г А Д №5

па Народнаму Камісарыяту Земляробства Беларускае С.С.Р.

"12" Кастрычніка 1929 г.

§ I.-

Загадчыкам Палескай Раённай Пясчанай Станцыі прызначаецца з II-га Кастрычніка тав. ПРЫШЧЭПАЎ Зьмітра Філімонаў з акладам пэнсіі ў 198 руб. у месяц, на якога ускладаюцца абавязкі распарадчыка крэдытаў, прадугледжаных каштарысам станцыі, кіраваньне станцыяй и адказнасьць за маёмасьць станцыі.

§ 2.-

Выконваючага абавязкі Загадчыка Палескай Раённай Пясчанай Станцыі тав.ТРЫЗНА прызначыць Намесьнікам Загадчыка гэтай станцыі з II-га Кастрычніка г/г з захаваньнем раней атрымліваемай ім пэнсіі.-

НАРОДНЫ КАМІСАР ЗЕМЛЯРОБСТВА

/РАЧЫЦКІ/.-

**Загад наркама земляробства БССР П. Рачыцкага ад 12 кастрычніка 1929 года аб прызначэнні Д.Ф. Прышчэпава загадчыкам Палескай раённай пясчанай станцыі**
Крыніца: НАРБ.

ним всячески. Мама об этом после рассказывала, когда съездила к нему на север. Забавляясь, следователи приставляли папе пистолет к виску, ему на голову, каплю за каплей, лили воду, применяли другие, изощренные, садистские, методы выколачивания нужных показаний. В тюрьме папа хотел повеситься, разорвал на полоски простыню, свил петлю и уже накинул ее на себя, но надзиратель в последний момент заметил. Его полуживого из петли вынули, а когда он очнулся, продолжали издеваться» *[25]*.

У абвінаваўчым заключэнні сакрэтнага аддзела паўнамоцнага прадстаўніцтва АДПУ па Беларускай ваеннай акрузе (БВА) ад 2 студзеня 1931 года па справах Д. Прышчэпава, А. Баліцкага, А. Адамовіча і П. Ільючонка адзначалася: «вышеупомянутая четверка обвиняемых, бывших коммунистов, занимая высокоответственные посты в советском правительственном аппарате Беларуси, всемерно помогало руководству организации в проведении следующих конкретных контрреволюционных мероприятий: 1) способствование собиранию и концентрации контрреволюционных нац. демократических сил в учреждениях, ими руководимых, что фактически помогало направлению деятельности советских учреждений, ими возглавляемых, соответственно задачам организации; 2) способствование практической постановке пропаганды всего круга нац. демократических идей в учебных заведениях, литературе, печати; 3) пропагандируя идею «Союза западных Республик» во главе с Польшей, способствуя отрыву научных учреждений от всесоюзных центров, обвиняемые целиком и полностью содействовали политическим сепаратистским стремлениям организации «СВБ» и вели к прямому расколу партии; 4) являлись основными проводниками в среду организации сведений, носивших характер государственной тайны; 5) способствовали распространению контрреволюционных литературных произведений, написанных нац. демократическими поэтами и писателями по заказу центра «СВБ», причем, помимо распространения внутри БССР, содействовали нелегальному помещению их (произведений) в заграничной национал-фашистской печати, т.е. совершили преступление, предусмотренное 76–64 ст. УК БССР (58-11, 58-2 УК РСФСР)» *[26]*.




**Вокладка працы Д.Ф. Прышчэпава. 1925 год**
Крыніца: Нацыянальная бібліятэка Рэспублікі Беларусь.

На падставе абвінавачання сакрэтны аддзел ПП АДПУ па БВА, спасылаючыся на пастанову ЦВК СССР ад 9 чэрвеня 1927 года, прыняў рашэнне справу накіраваць у судовую калегію АДПУ для вынясення пазасудовага прысуду. Пастановай калегіі АДПУ ад 18 сакавіка 1931 года Д. Прышчэпаў, А. Баліцкі, А. Адамовіч і П. Ільючонак былі на падставе артыкула 58 п. 2 і п. 11 Крымінальнага кодэкса РСФСР асуджаны да 10 год зняволення *[25]*. Астатнія 86 чалавек, што праходзілі па сфабрыкаванай справе «Саюза вызвалення Беларусі», пастановай калегіі АДПУ СССР ад 10 красавіка 1931 года былі асуджаны на розныя тэрміны пакарання. У працэсе следства справа на 18 чалавек была спынена *[27]*.

Пакаранне Д. Прышчэпаў адбываў на будаўніцтве Беламорска-Балтыйскага канала. У 1932 годзе яму нават дазволілі дзесяцідзённае спатканне з жонкай. У 1933 годзе Д. Прышчэпаў быў этапаваны ў Паўночна-Усходні лагер НКУС Далёкаўсходняга краю (Бухта Нагаева).

Праз сем год зняволення Дзмітрыя Прышчэпава датэрмінова вызвалілі. 24 чэрвеня 1937 года ён апынуўся на волі і адразу ж адправіў жонцы з дзецьмі тэлеграму: «Освободился. Целую Любу, Нелика, Алечку» *[25]*. Дзмітрый Філімонавіч быў вымушаны застацца на Далёкім Усходзе. Яго пасада, у адрозненне ад месца працы, змянілася, ён стаў эканамістам-планавіком каланізацыйнага бюро папраўча-працоўнага лагера. Дзмітрыю Прышчэпаву не было наканавана ўз'яднацца з сям'ёй. 13 жніўня 1937 года яго зноў арыштавалі, на гэты раз у Магадане, у сувязі з наноў адкрытымі абставінамі.

У студзені 1939 года Д. Прышчэпава этапавалі ў Мінск. На радзіме яму прад'явілі абвінавачанне ў шпіянажы на карысць буржуазнай Польшчы па чарговай сфабрыкаванай справе. І хоць Дзмітрый Прышчэпаў катэгарычна адхіліў прад'яўленыя абвінавачанні, Ваенны трыбунал Беларускай ваеннай акругі 20 лістапада 1939 года асудзіў яго на падставе артыкула 68 п. «а», 69, 76 Крымінальнага кодэкса БССР да выключнай меры пакарання – расстрэлу з канфіскацыяй маёмасці *[28]*. Паводле афіцыйнай версіі, Дзмітрый Філімонавіч Прышчэпаў памёр 31 студзе-

ня 1940 года ў турэмнай бальніцы г. Мінска, па заключэнні лекара, ад паралічу сэрца з абвастрэннем сухотаў *[25]*.

Пасля смерці Сталіна ў 1953 годзе ў СССР пачынаюцца працэсы дэмакратызацыі ў грамадстве, а таксама стабілізацыі правапарадку, аднаўлення законнасці, рэабілітацыі ахвяр сталінізму. 11 сакавіка 1956 года Ваенная калегія Вярхоўнага Суда СССР прыняла рашэнне аб пасмяротнай рэабілітацыі Д. Прышчэпава. Нягледзячы на гэтае рашэнне, яшчэ на працягу трыццаці двух год Дзмітрый Прышчэпаў па-ранейшаму заставаўся ворагам народа, членам міфічнай арганізацыі нацыянал-дэмакратаў, паколькі першы яго прысуд не быў перагледжаны.

У канцы 1980-х гадоў пачаўся другі перыяд рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій. Падчас яго і быў канчаткова рэабілітаваны Д. Прышчэпаў. Калегія па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР, прааналізаваўшы матэрыялы справы Прышчэпава, палічыла факт існавання арганізацыі «Саюз вызвалення Беларусі» не даказаным і 14 чэрвеня 1988 года вынесла пастанову: «Постановление коллегии ОГПУ от 18 марта 1931 года в отношении Прищепова Д.Ф., Балицкого А.В., Адамовича А.Ф. и Ильюченка П.В. отменить и делопроизводство прекратить за отсутствием в их действиях состава преступления» *[28, с. 33]*.




**Вокладка працы Д.Ф. Прышчэпава. 1926 год**
Крыніца: Нацыянальная бібліятэка Рэспублікі Беларусь.

У 1988 годзе актыўна працавала камісія Бюро ЦК КПБ па дадатковым вывучэнні матэрыялаў, звязаных з рэпрэсіямі, якія мелі месца ў перыяд 1930–1940-х гадоў і пачатку 1950-х гадоў. Яе справаздачы публікаваліся на старонках газеты «Советская Белоруссия». У нататцы ад 23 лістапада 1988 года адзначалася, што «только за 9 месяцев т. г. органами прокуратуры изучены и принесены протесты об отмене состоявшихся решений и прекращении 143 уголовных дел на 411 человек. Все протесты судами удовлетворены и таким образом сняты незаслуженные обвинения еще с 411 человек, в том числе с бывших: наркома земледелия Прищепова Д.Ф., наркома просвещения Балицкого А.В., заведующего отделом печати ЦК КП(б)Б, а после работавшего заместителем наркома земледелия БССР Адамовича А.Ф., заместителя заведующего Госиздатом Ильюченка П.В.» *[29]*.

Услед за прававой адбылася партыйная рэабілітацыя Дзмітрыя Прышчэпава. Так, у сакавіку 1989 года Бюро ЦК КПБ, разглядзеўшы матэрыялы вышэйзгаданай камісіі адносна некаторых асоб, неабгрунтавана выключаных з партыі і асуджаных да вышэйшай меры крымінальнага пакарання, а затым поўнасцю рэабілітаваных у судовым парадку, прыняла рашэнне пасмяротна аднавіць у КПБ-КПСС 12 чалавек, у тым ліку і Д. Прышчэпава *[30]*.

Дзякуючы артыкулам Э. Іофе *[28]*, М. Кузняцова *[19, 24]* і Л. Шумана *[31]*, што былі надрукаваны ў 1989–1990 гадах на старонках вядучых рэспубліканскіх выданняў, адбылося аднаўленне ў грамадстве сумленнага імя Д. Прышчэпава.

Журналіст «Сельской газеты» І. Акшэўскі ў 1991 годзе, напярэдадні 95-годдзя з дня нараджэння Дзмітрыя Прышчэпава, апублікаваў аповесць «Он любил эту землю», у якой аднавіў шматлікія белыя плямы ў біяграфіі былога наркама земляробства БССР *[25]*. І. Акшэўскі праехаў тысячы кіламетраў, каб сустрэцца і пагутарыць з усімі сваякамі Д. Прышчэпава, якія на той момант заставаліся ў жывых.

Дзмітрый Філімонавіч быў сапраўдным сынам беларускага народа. Дзе б ні працаваў, якія б пасады ні займаў, усюды ён пакінуў добрую памяць пра сябе: прыклаў вялікія намаганні для развіцця сацыяльнай сферы Сенненскага павета, а таксама ў барацьбе з бандытызмам у Веліжскім павеце, падпісаў акт аб вяртанні часткі тэрыторыі Віцебскай губерні ў склад БССР. Як наркам земляробства праводзіў аграрную палітыку пад лозунгам «Беларусь – чырвоная Данія». І нават пасля таго, як быў пазбаўлены ўсіх пасад, дзякуючы яму ў Скрыгалаве, дзе ён працаваў загадчыкам пясчанай станцыі, з’явілася электрычнасць.

На жаль, імя Д.Ф. Прышчэпава сёння ў нашай краіне ніяк не ўвекавечана. Вуліцы імя Прышчэпава, старшыні Віцебскага губвыканкама, а затым наркама земляробства, подпіс якога стаіць пад актам уз’яднання Віцебшчыны з Беларуссю, ні ў Мінску, ні ў Віцебску, ні ў Сянно, ні ў якім іншым населеным пункце Беларусі няма.

Безумоўна, асоба Дзмітрыя Прышчэпава і яго заслугі перад Радзімай вартыя таго, каб хаця б у адным з тых месцаў, дзе ён жыў і працаваў, быў усталяваны помнік ці мемарыяльная дошка ад удзячных нашчадкаў. Асабліва ўлічваючы, што няма нават надмагільнага помніка, бо да сённяшняга дня дакладна невядома тое месца, дзе былі захаваны астанкі былога наркама земляробства БССР пасля таго, як ён знайшоў вечны спакой.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 20.10.2021 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1273. Арк. 31.
2. НАРБ. – Ф. 265. Воп. 1. Спр. 1396. Арк. 14.
3. НАРБ. – Ф. 7. Воп. 1. Спр. 54. Арк. 31 адв.
4. Збор законаў і распараджэнняў Рабоча-Сялянскага Ўрада Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, 1925. – № 22. – С. 2.
5. НАРБ. – Ф. 11. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 3.
6. П. Т. Сельска-гаспадарчая сэкцыя Інстытуту Беларускае Культуры / П. Т. // Сельская і лясная гаспадарка. – 1927. – № 1. – С. 82.
7. Трахімаў, А. Роля Інбелкульту ў організацыі навукова-дасьледчай працы па сельскай і лясной гаспадарцы // А. Трахімаў // Сельская і лясная гаспадарка – 1929. – № 1. – С. 8.
8. История аграрной науки Беларуси (XIX – начало XXI в.): в 2 ч. / В.Г. Гусаков [и др.]; редкол.: В.Г. Гусаков (гл. ред.) [и др.]. – Минск: Беларуская навука, 2017. – Ч. 1. – С. 142.
9. НАРБ. – Ф. 15п. Воп. 22. Спр. 83. Арк. 42.
10. НАРБ. – Ф. 15п. Воп. 22. Спр. 93. Арк. 41.
11. НАРБ. – Ф. 7. Воп. 1. Спр. 793. Арк. 4.
12. НАРБ. – Ф. 34. Воп. 1. Спр. 692. Арк. 135.
13. НАРБ. – Ф. 31. Воп. 1. Спр. 279. Арк. 76.
14. НАРБ. – Ф. 15п. Воп. 28. Спр. 7. Арк. 14.
15. На крутым павароце: ідэолага-палітычная барацьба на Беларусі ў 1929–1931 гг.: дакументы, матэрыялы, аналіз / Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы. – Мінск, 1999. – С. 84, 243.
16. Так начиналась национальная трагедия // Нёман. – 1992. – № 9. – С. 139–141.
17. НАРБ. – Ф. 15п. Воп. 5. Спр. 164. Арк. 29.
18. НАРБ. – Ф. 15п. Воп. 22. Спр. 113. Арк. 83.
19. Кузняцоў, М. Першы нарком земляробства / М. Кузняцоў // Голас Радзімы. – 1989. – 3 жн. – С. 4.
20. Збор законаў і распараджэнняў Рабоча-Сялянскага Ўрада Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. – 1929. – Адд. 2. – Паст. 141.
21. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 4327. Арк. 395–396.
22. НАРБ. – Ф. 48. Воп. 1. Спр. 3709. Арк. 170.
23. Капач, М. Апошняя пасада былога наркама / М. Капач // Памяць: Мазыр. Мазырскі раён: гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / [укладальнікі: М.А. Капач, В.Р. Феранц]. – Мінск, 1997. – С. 169.
24. Кузняцоў, М. Вяртанне з нябыту / М. Кузняцоў // Чырвоная змена – 1990. – 12 ліп. – С. 5.
25. Акшевский, И. Он любил эту землю: повесть о наркоме, неправедно осужденном, сосланном и, вероятно, расстрелянном, не получившем после своей смерти пяди родной земли на могилу / И. Акшевский. – Минск: Беларусь, 1991. – С. 5, 102, 105.
26. НАРБ. – Ф. 15п. Воп. 28. Спр. 14. Арк. 56.
27. Знешняя палітыка Беларусі: Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 3: (1928 г. – чэрвень 1941 г.) / склад. У. М. Міхнюк і інш.; рэдкал.: У.Р. Латыпаў і інш. – Мінск, 2001. – С. 262.
28. Иоффе, Э. Нарком земледелия / Э. Иоффе // Человек и экономика. – 1991. – № 2. – С. 32–33.
29. В Комиссии Бюро ЦК Компартии Белоруссии по дополнительному изучению материалов, связанных с репресиями, имевшими место в период 30–40-х и начала 50-х годов // Советская Белоруссия. – 1988. – 23 ліст. – С. 1.
30. В Бюро ЦК Компартии Белоруссии // Советская Белоруссия. – 1989. – 24 сак. – С. 1.
31. Шуман, Л. «Плуг» наркома: о наркоме земледелия Белоруссии / Л. Шуман // Сельская газета. – 1990. – 2 июня – С. 2–3.